В настоящий момент часовня не функционирует. В ближайшее время планируется ее реставрация.

Кроме вышеупомянутых памятников также можно назвать корчму 1778 г. постройки проекта Я. С. Беккера, находящегося рядом с костелом [6, с. 746]. В других источниках В. В. Калнин утверждает, что данное здание могло быть использовано как магистрат, а в советское время было столовой. До наших дней постройка сохранила основную планировку, но особенности архитектурного стиля были утрачены.


*1.* Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси, издаваемый при управлении Виленского учебного округа. – Вильно : Печатня Губернского правления, 1867. – Т. IV. – 409 с.

*2.* Гродненские епархиальные ведомости. – 1909. – № 22.

*3.* Гродненский православно-церковный календарь «Православие в Брестско-Гродненской земле в конце 19 в.», – Воронеж : Тип. В. И. Исаева, 1899. – Т. 1. – 837 с.

*4.* Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Брэсцкая вобласць / Акад. навук БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору, БСЭ ; рэдкал.: С. В. Марцэлеў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БСЭ, 1984. – 340 с.

*5. Чантурия, В. А.* Памятники архитектуры и градостроительства Белоруссии / В. А. Чантурия. – Минск : Полымя, 1986. – 236 с.

*6. Kalnin, W. W.* Nurt barokowy w tworczosci J. S. Beckera architekta domu Sapiehow / W. W. Kalnin // Kultura artystyczna Wielkiego Księstwa Litewskiego w epoce baroku : zb. art. – Warszawa, 1995. – S. 213–228.



С. А. ПАЦЫЕНКА


## РЭПРЭЗЕНТАЦЫЯ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ САПЕГАЎ У СУЧАСНАЙ САЦЫЯКУЛЬТУРНАЙ ПРАСТОРЫ БЕЛАРУСІ

Тэндэнцыя да пераасэнсавання культурнага вопыту арыстакратыі Вялікага Княства Літоўскага характэрна для культуры Беларусі XXI ст. Менавіта ў новым тысячагоддзі зварот да пласта элітарнай культуры і гісторыі знайшоў адлюстраванне ў адкрыцці наведванняў шэрагу магнацкіх рэзідэнцый. Так, у 2010 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пасля заканчэння рэстаўрацыйна-ўзнаўленчых работ адбылося адкрыццё замкавага комплексу «Мір». У пачатку 2011 г. быў адкрыты музей «Ружанскі палацавы комплекс роду Сапегаў». У 2012 г. завершаны рэстаўрацыйныя работы, і для наведвальнікаў адчыніліся экспазіцыйныя залы Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Нясвіж». Беларусь паступова пачала вяртаць сабе гістарычную назву «краіны замкаў», а ў турыстычныя даведнікі трапілі прозвішчы беларускіх магнатаў.

У 2000 г. значнасць Мірскага замка, а ў 2005 г. Нясвіжскага замка былі прызнаныя сусветнай культурнай грамадскасцю шляхам уключэння гэтых комплексаў у Спіс аб’ектаў Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Паказальны той факт, што Мірскі замак быў уключаны ў Спіс не толькі як выдатны ўзор цэнтральнаеўрапейскага замка, які сімвалізуе паступовую змену культурных стыляў (готыкі, рэнесансу, барока), але і як наглядная адлюстраванне ў форме і знешнім выглядзе ансамбля доўгай гісторыі палітычных і культурных супрацьстаянняў і ўзаемадзеянняў [5]. У свой час Нясвіжскі замак быў унесены ў спіс як выбітны прыклад архітэктурнага ансамбля, які паказвае значны перыяд гісторыі чалавецтва [6].

Натуральна, што адкрыццё былых рэзідэнцый стала вынікам дасціпнай працы даследчыкаў папярэдніх стагоддзяў і асабліва XX ст. Гісторыкі (Г. Галенчанка, А. Грыцкевіч, А. Краўцэвіч, С. Куль-Сяльвёрстава, П. Лойка, Г. Сагановіч) адкрывалі невядомыя факты з жыцця беларускай арыстакратыі, аналізавалі гістарычныя матэрыялы. Археолагі, рэстаўратары, гісторыкі архітэктуры (В. Калнін, М. Ткачоў, А. Трусаў, Ю. Чантурыя) збіралі апісальны матэрыял, вывучалі гістарычныя дакументы, праводзілі раскопкі і навуковыя даследаванні. Літаратуразнаўцы (А. Мальдзіс), мастацтвазнаўцы (В. Бажэнава, Г. Барвенава, Г. Барышаў, Н. Высоцкая, Т. Габрусь, В. Дадзіёмава, В. Пракапцова) узнаўлялі забытыя імёны і творы мастацтва, вывучалі дзейнасць прыватнаўласніцкіх тэатраў, капэл і г. д. Філосафы і культуролагі здзяйснялі культурна-гістарычнае асэнсаванне ролі магнатаў на беларускіх землях (Э. Дарашэвіч, У. Конан, С. Падокшын, А. Смолік).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Прадстаўнікі магнацкага роду Сапегаў зрабілі значны ўнёсак у развіццё культуры на тэрыторыі сучаснай Беларусі. Магнацкі род Сапегаў у Вялікім Княстве Літоўскім лічыўся другім па значэнні пасля Радзівілаў. На працягу XV–XVIII стст. прадстаўнікі роду займалі пасады гетманаў, канцлераў, падканцлераў, ваявод, кашталянаў, маршалкаў і інш. Высокі культурны ўзровень, добрая адукацыя, шырыня светапогляду, фінансавыя магчымасці дазвалялі Сапегам падтрымліваць развіццё культуры, збіраць і захоўваць культурныя каштоўнасці. У выніку культуратворчай дзейнасці прадстаўнікоў роду іх уладанніператварыліся ў буйныя сацыякультурныя цэнтры.

Паходжанне роду Сапегаў выклікала шмат спрэчак. Імкненне мець славутую радавую гісторыю, якая ў асяроддзі магнатаў была адной з самых вялікіх каштоўнасцей, часам прыводзіла да свядомай фальсіфікацыі дакументаў альбо стварэння міфічных першапродкаў. У XVII–XVIII стст. былі складзены радаводы Сапегаў, у якіх сцвярджалася пра княскае паходжанне роду ад Нарымонта, сына Гедзіміна. У XVIII–XIX стст. з'явіліся даныя аб паходжанні роду ад троцкага кашталяна Сунігайлы, праўнука Нарымонта. Аднак пазней даследчыкі А. Банецкі, Ю. Вольф і У. Сямковіч высветлілі, што Сапегі паходзяць ад Сямёна Сапігі (Сапегі), які быў у 1440-х гг. вялікакняжацкім пісарам з полацкіх баяр [3, с. 545]. Прага княскага паходжання прадстаўнікамі роду вылілася ў фальсіфікацыю дакументаў для Метрыкі ВКЛ. У 1744 г. канцлер Ян Фрэдэрык Сапега ўпісаў у Метрыку несапраўдныя звесткі пра наданне ў студзені 1572 г. Івану Сямёнавічу Сапегу графскага тытула ад германскага імператара Максіміліяна ІІ і пацвярджэнне гэтага тытула Жыгімонтам ІІ Аўгустам. На падставе гэтых запісаў сойм Рэчы Паспалітай прызнаў усіх прадстаўнікоў роду князямі, нашчадкамі Нарымонта Гедзімінавіча [3, с. 546].

Нягледзячы на той факт, што ў выніку гістарычных падзей прадстаўнікі роду пакінулі беларускія землі, спадчына роду Сапегаў займае значнае месца ў культуры сучаснай Беларусі. Сярод прадстаўнікоў роду было шмат знакамітых асоб, адным з якіх з'яўляецца Леў Сапега – выдатны палітык, дыпламат і дзяржаўны дзеяч. Леў Сапега нарадзіўся ў мястэчку Астроўна Бешанковіцкага раёна Віцебскай вобласці, аб чым сведчыць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

памятны знак у цэнтры сучаснага аграгарадка, які з'явіўся ў 2005 г. На гранітнай пліце размешчаны тэкст: «Тут, у мястэчку Астроўна, 4.IV.1557 нарадзіўся Леў Сапега – выбітны грамадскі і дзяржаўны дзеяч Вялікага Княства Літоўскага».

Акрамя дзяржаўна-палітычнай дзейнасці Леў Сапега садзейнічаў развіццю беларускіх земляў, аб чым сёння сведчаць помнікі канцлеру, размешчаныя ў Лепелі і Слоніме. У 1586 г. Леў Сапега, у чыю вотчыну ўваходзілі Лепельскія землі, выбраў для горада Лепеля больш зручнае размяшчэнне і перанёс гандлёвыя рады і касцёлы за тры кіламетры на новае месца, дзе знаходзіцца сучасны Лепель. У 2010 г. ля ўвахода ў цэнтральны гарадскі парк Лепеля быў усталяваны помнік Льву Сапегу (скульптар Леў Аганаў). Будучы старастам Слоніма, Сапега актыўна спрыяў развіццю горада, пры ім Слонім стаў цэнтрам рамёстваў і гандлю, атрымаў Магдэбургскае права, герб. У 2019 г. у Слоніме быў усталяваны другі помнік Льву Сапегу ў Беларусі (скульптары Іван Міско, Уладзімір Піпін і Сяргей Логвін).

У 2007 г. у гонар Льва Сапегі названа адна з мінскіх вуліц, у Слоніме ёсць плошча, якая носіць імя канцлера. У 2010 г. Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь былі выпушчаныя дзве памятныя манеты ў гонар Льва Сапегі.

У 2011 г. у межах міжнароднага праекта «Віртуальная рэканструкцыя бібліятэкі роду Сапегаў» Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі пры падтрымцы ЮНЕСКА быў выдадзены кампакт-дыск «Сапегіяна: кнігазбор роду Сапегаў». Гэта электроннае выданне змяшчае матэрыялы па гісторыі кніжных збораў роду Сапегаў, якія мелі некалькі буйных бібліятэк у Слоніме, Ружанах, Дзярэчыне, Кодані. На сёння большая частка кніг з гэтых збораў захоўваецца ў Расійскай нацыянальнай бібліятэцы, Бібліятэцы Расійскай акадэміі навук, бібліятэках Вільнюскага і Варшаўскага ўніверсітэтаў. На дыску прадстаўлены каталог кніг, якія належалі раней зборам Сапегаў, паўнатэкставыя копіі найбольш каштоўных выданняў з калекцыі Расійскай нацыянальнай бібліятэкі, а таксама матэрыялы па генеалогіі і бібліяграфія па гісторыі роду Сапегаў і іх бібліятэк [7].

Прадстаўнікам роду Сапегаў належаў шэраг замкавых пабудоў на тэрыторыі сучаснай Беларусі. Напрыклад, захаваліся

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

звесткі аб тым, што Геранёнскі замак у канцы XVI–XVII ст. некаторы час належаў Сапегам. Гальшанскі замак быў узведзены Сапегамі ў першай палове XVII ст., аднак у тым жа стагоддзі перайшоў да іншых гаспадароў [88, с. 57].

Можна з упэўненасцю сказаць, што сёння месцам лакалізацыі радавой гісторыі Сапегаў з’яўляецца Ружанскі палацавы комплекс. Менавіта замкавая або палацавая прастора з’яўлялася матэрыяльным і духоўным увасабленнем гісторыі арыстакратычных родаў, канкрэтным прасторавым месцапалажэннем радавога часу арыстакратычных сем’яў.

Будаўніцтва ўласнага замка стала справай прэстыжу для прадстаўнікоў арыстакратыі Вялікага Княства Літоўскага, якія, валодаючы значнымі фінансавымі сродкамі, імкнуліся паказаць сваю моц. Заняўшы ў папярэднія часы адпаведныя амбіцыям і імпэту пасады, уладкаваўшы кар’еру, Радзівілы, Пацы, Сапегі мелі высокае становішча ў грамадстве. Аднак сваю значнасць трэба было дэманстраваць і падтрымліваць. «Для таго, каб заслужыць і захаваць павагу людзей, недастаткова толькі валодаць багаццем і ўладай. Багацце ці ўладу трэба зрабіць відавочнымі, бо павага аказваецца выключна па прадстаўленні доказаў» [44, с. 84]. Самым відавочным доказам асабістай значнасці і наяўнасці багацця было ўзвядзенне ўласнай рэзідэнцыі. О. Шпенглер падкрэсліў функцыю знешняй дэманстратыўнасці будынка наступным чынам: «Замак з яго пакоямі, вежамі, сценамі і ровамі гаворыць пра магутна працякаючае быццё» [9, с. 351].

Прынцыпова важны той момант, што ўладанне рэзідэнцыяй давала магнатам магчымасць атрымання тытула, валоданне якім мела ў асяроддзі арыстакратаў асаблівае значэнне. У сярэдзіне XVI ст. у Вялікім Княстве Літоўскім спадчынныя тытулы князя, графа згубілі сацыяльныя і юрыдычныя перавагі перад астатняй шляхтай. Аднак магнатэрыя працягвала дабівацца атрымання тытулаў ад імператара Свяшчэннай Рымскай імперыі. У 1569 г. графскі тытул атрымалі Тышкевічы, у 1700 г. тытул князёў Свяшчэннай Рымскай імперыі германскай нацыі – Сапегі. Нягледзячы на ігнараванне тытулаў у Вялікім Княстве Літоўскім, іх наяўнасць не страціла свайго значэння ў асяроддзі арыстакратыі. Разам з тым астатняя шляхта, наблізіўшыся

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ў правах да магнатэрыі і дабіўшыся адмены арыстакратычных тытулаў, не магла параўнацца з імі ў прадстаўнічасці свайго жылля.

Асобныя элементы замкавых інтэр'ераў сталі відавочным доказам старажытнага і высакароднага паходжання гаспадароў. Вялікія партрэтныя галерэі адлюстроўвалі магутнасць і прадстаўнічасць магнацкіх родаў. Напрыклад, вялікімі памерамі адрознівалася жывапісная калекцыя Сапегаў у Ружанскім палацы, якая акрамя партрэтаў прадстаўнікоў роду ўтрымлівала выявы іншых знакамітых асоб, сярод якіх Ян ІІІ, Аўгуст ІІ, Фрыдрых ІІ.

У 2012 г. у Вільнюсе ў Нацыянальнай мастацкай галерэі праходзіла выстава «Сапегі – дзяржаўныя дзеячы, мецэнаты і калекцыянеры» пад ганаровым патранатам князя Міхала Сапегі, які цяпер жыве ў Бельгіі. З Кракава былі прывезены 72 партрэты, пачынаючы з Гедзіміна і легендарнага Сямёна Сапегі. Куратары гэтай унікальнай выставы здолелі акрамя партрэтаў прадстаўнікоў слыннага роду паказаць рарытэтныя рэчы і мэблю з палацавых інтэр'ераў Сапегаў, кнігі з іх бібліятэкі, дакументы, выданні Статута 1588 г. і інш.

Сімволіка культуры арыстакратыі ўвасобілася ў элементах палацавай прасторы. Разнастайныя прадметы інтэр'ера і экстэр'ера ўтрымлівалі выявы геральдычных сімвалаў. Напрыклад, распаўсюджанай з'явай было аздабленне кафляных печаў геральдычным арнаментам. Гэты тып арнаментыкі быў добра распрацаваны: часам на парадных варыянтах гербаў на кафлі печаў змяшчаліся пачатковыя літары імя, прозвішча, пасады і тытула гаспадара. Напрыклад, у Гальшанскім замку камін, складзены ў пачатку XVII ст., меў выяву герба «Ліс» і ініцыялы «P S» – Павел Сапега.

Спадчынныя знакі паўсюль суправаджалі арыстакрата на працягу жыцця. Гербы размяшчаліся на харугвах, сцягах, шчытах, пячатках, манетах. Уладальнікі ўпрыгожвалі імі хатняе начынне, рукапісы, творы мастацтва. Радавымі гербамі аздабляліся архітэктурныя дэталі і прадметы інтэр'ера ў прыватнаўласніцкіх рэзідэнцыях. Выявы гербаў Пацаў, Сапегаў, Хадкевічаў, Радзівілаў былі на гарматах, адлітых у прыватных людвісарнях [1, с. 285]. Некаторыя магнаты пераносілі выяву ўласнага герба

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ці асобныя яго элементы на гербы гарадоў, што ім належалі. Так, геральдычны сімвал з родавага герба Сапегаў «Ліс» утрымліваецца ў гербе Слоніма, якім валодалі прадстаўнікі роду. З развіццём і пашырэннем кнігадрукавання з'явілася геральдычная гравюра. Адлюстраваннямі гербаў магнатаў-мецэнатаў, на сродкі якіх выходзілі кнігі, аздабляліся адвароты тытулаў. Напрыклад, герб Льва Сапегі ўпрыгожваў «Служэбнік» (1617) [4, с. 63].

Сучасная гісторыя радавога гнязда Сапегаў у Ружанах пачалася ў 2008 г. маштабнымі рэстаўрацыйнымі работамі. У 2011 г. у будынку ўсходняга флігеля адбылося афіцыйнае адкрыццё музея «Ружанскі палацавы комплекс роду Сапегаў». На сёння адрэстаўраваны два флігелі і ўязная брама. Для наведвальнікаў адкрыты чатыры экспазіцыйныя і адна выставачная залі. У заходнім флігелі знаходзіцца экспазіцыя, прысвечаная гісторыі Ружан – галоўнай рэзідэнцыі роду Сапегаў. Узнаўленне гістарычнага аблічча Ружанскага палацавага комплексу дазволіла актывізаваць цікавасць турыстаў, падкрэсліць індывідуальнасць культуры рэгіёна і прадэманстраваць павагу беларусаў XXI ст. да гістарычнай спадчыны Сапегаў.

На жаль, практычна ўсе матэрыяльныя каштоўнасці, якія належалі роду Сапегаў, знаходзяцца па-за межамі Беларусі. Асноўны фонд музея ў Ружанах складае 1510 прадметаў, найбольш каштоўныя з якіх – пячатка XVII ст. з фамільным гербам «Ліс», арыгінальны драўляны гербавы картуш канца XVIII ст., напольны гадзіннік канца XIX ст., арыгінальныя падсвечнікі, падораныя Траецкаму касцёлу ўладальнікамі мястэчка, і інш. Аднак страчаная спадчына роду Сапегаў у XXI ст. пераадолела формы матэрыяльнага ўвасаблення і вяртаецца на радзіму ў форме інфармацыйных рэсурсаў – лічбавых копій, віртуальных макетаў, электронных бібліятэк і інш. Анімацыйныя праграмы і тэатралізаваныя імпрэзы вяртаюць слаўных Сапегаў на родную зямлю, рэпрэзентуюць спадчыну славутага роду як буйной гісторыка-культурнай каштоўнасці Беларусі.

*1.* Археалогія Беларусі : у 4 т. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гіст. ; пад рэд. В. М. Ляўко [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 1998–2001. – Т. 3 : Сярэдневяковы перыяд (IX–XIII стст.) / *Я. Г. Звяруга* [і інш.] ; навук. рэд. П. Ф. Лысенка. – Мінск : Беларус. навука, 2000. – 554 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. *Веблен, Т.* Теория праздного класса / Т. Веблен ; пер. с англ. С. Г. Сорокиной ; общ. ред. В. В. Мотылева. – М. : Прогресс, 1984. – 367 с.

3. Вялікае княства Літоўскае : энцыкл. У 2 т. Т. 2 : Кадэцкі корпус – Яцкевіч / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] ; маст. З. Э. Герасімовіч. – Мінск : БелЭн, 2006. – 792 с.

4. Гісторыя беларускага мастацтва : у 6 т. / Акад. навук БССР, Ін-т мастацтвазн., этнаграфіі і фальклору ; рэдкал. С.В. Марцэлеў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1987–1994. – Т. 1 : Ад старажытных часоў да другой паловы XVI ст. / рэдкал.: С. В. Марцэлеў (гал. рэд.) [і інш.] ; рэд. тома С. В. Марцэлеў, Л. М. Дробаў. – 1987. – 304 с.

5. Замковый комплекс «Мир» [Электронный ресурс] // Мир. – Режим доступа: https://mirzamak.by/istoriya/vsemirnoe-nasledie/. – Дата доступа: 01.04.2021.

6. Национальный историко-культурный музей-заповедник «Несвиж» [Электронный ресурс] // Несвиж. – Режим доступа: https://niasvizh.by/history/dvortsovyy_kompleks/. – Дата доступа: 01.04.2021.

7. Сапегіяна: кнігазбор роду Сапегаў [Электронны рэсурс] // Нацыянальная бібліятэка Беларусі. – Рэжым доступу: https://nlb.by/by/pra-bibliyateku/vydavetskaya-praduktsyya-bibliyateki/elektronnyya-vydanni-bibliyateki/elektronnyya-vydanni-2009-2011-gg-/elektronnyya-vydanni-2011-goda-/sapegiyana-knigazbor-rodu-sapega-sapegiana-knizhno/. – Дата доступу: 30.03.2021.

8. *Ткачоў, М. А.* Замкі Беларусі / М. А. Ткачоў ; пад. рэд. В. Ф. Барысевіча. – Мінск : Полымя, 1977. – 82 с.

9. *Шпенглер, О.* Закат Европы. Очерки морфологии мировой истории / О. Шпенглер ; пер. и прим. И. И. Маханькова. – М. : Мысль, 1998. – 538 с.

Е. А. ЛАПИКОВА

# АНАЛИЗ ТУРИСТСКО-ЭКСКУРСИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ ДВОРЦОВОГО КОМПЛЕКСА РОДА САПЕГ

По мнению исследователя аристократической культуры С. Пациенко, современная социокультурная ситуация в Республике Беларусь характеризуется устойчивым интересом общества к наследию аристократии Великого Княжества Литовского. «Сохранившиеся до наших дней резиденции известных аристократических семей обладают значительным культурным



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ